Калейдаскоп

снежань 2020

Школьная газета №4(24)

“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”

Ф. Багушэвіч

Паэты і пісьменнікі пра мову

Калейдаскоп
снежань 2020

Мова мая

Мова мая -
шум гаёў напрадвесні,
стан дзявочы бяроз,
звонкі спеў салаўя
і матуліны шчырыя песні -
мова мая.
Мова мая -
гэта сола заранкі,
незабудак блакіт,
перазвон ручая
і над стрэхамі шапка буслянкі -
мова мая.
Мова мая -
ціхі шэпат калосся,
ветру лёгкі павеў
і гудзенне чмяля,
кропка жаўранка ў паднябессі -
мова мая.
Мова мая -
пах дзівосны язміну,
смак крынічнай вады,
ў небе сум жураўля,
за сялом карагода рабінаў -
мова мая.

Паэты і пісьменнікі пра мову

Калейдаскоп
снежань 2020

Мова мая –
жалкаванне жалейкі,
горкі кнігаўкі плач,
любых рук дабрыня
і валошак махнатыя вейкі –
мова мая.
Мова мая -
пералівы вясёлкі,
мяккі кужаль снягоў,
вечароў цішыня,
пад бажніцай купальскія зёлкі -
мова мая.

Мова мая -
то ўсмешка дзіцяці,
майго сэрца біццё
і пад сонцам - ралля,
хлеб духмяны ў бацькавай хаце -
мова мая.

Мова мая -
ручнікі-абярэгі,
крыж расстайных дарог,
і сустрэч цеплыня,
і прамая дарога да Бога -
мова мая.

Марыя Цімінская

Папулярызацыя беларускай мовы

Калейдаскоп
снежань 2020

Літаратурнае падарожжа “ Быў. Ёсць. Буду…”

10 снежня вучні 8 “В” удзельнічалі ў літаратурным падарожжы “ Быў. Ёсць. Буду…”, якое прысвячалася **90-годдзю Уладзіміра Караткевеча**. Вучні завочна пазнаёміліся з жыццёвым і творчым шляхам пісьменніка, даведаліся пра асаблівасці напісання твораў, жанравую разнастайнасць творчасці. Дзеці апавядалі пра незвычайныя выпадкі з жыцця пісьменніка, чыталі вершы, прыгадвалі пройдзеныя творы.

Літаратурнае падарожжа атрымалася пазнавальным і цікавым.

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юрчанка С. А.

Папулярызацыя беларускай мовы

Калейдаскоп
снежань 2020

«Гульнёвы падворак»

24 снежня ў рамках папулярызацыі беларускай мовы ў **3 «Б»** класе адбылося мерапрыемства **«Гульнёвы падворак»**. Мэта гэтага мерапрыемства: стварэнне атмасферы вяселага народнага свята, далучэнне дзяцей да традыцый народнай культуры, развіццё пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў, іх творчага патэнцыялу, веры ў сябе і свае магчымасці. Вучні з задавальненнем адгадвалі загадкі, складалі прыказкі, спявалі, удзельнічалі ў розных гульнях і жартах. Дзецям дадзенае мерапрыемства вельмі спадабалася.

Народныя традыцыі

Калейдаскоп
снежань 2020

СНЕЖАНЬ зіму пачынае, а год канчае.

Этымалогія назвы

Снежань азначае пачатак снегападу. Сама назва сведчыць пра характар гэтага месяца: "снежань". Па ім, лічылі ў народзе, раўняліся вясна і лета. Будзе снежань сухі - і яны будуць сухія, а выдасца цёплы, дык і лета такое ж: "У снежні адкрытае вуха - летам горача і суха". Правяралі і ўрадлівасць наступнага лета: "У снежні мароз і снег вышай хаты - год будзе багаты".

Народныя прыкметы месяца

Снежань зіму пачынае, а год канчае.
Снежань сцюжны з зімою дружны.
Снежань вока снегам цешыць, ды марозам вуха рве.
Сухі снежань - сухая вясна, сухое лета.

Беларускія каляндарныя святы

4 – Узвядзенне
9 – Юр'я
13 – Дзень святога Андрэя
19 – Мікола зімовы

- ***Разгледзеныя назвы месяцаў маюць шматвекавую гісторыю,***
- ***Месяцы «студзень», «люты» атрымалі сваё імёны праз свой «характар» надвор'я,***
- ***Месяцы «сакавік», «красавік», «чэрвень», «ліпень», «верасень», «лістапад», «снежань» атрымалі свае імёны праз характэрныя асаблівасці сезонаў года,***
- ***Назва месяца «май» (бел. травень) паходзіць ад уласнага імя Майя. Так у Старажытным Рыме звалі багіню зямлі і ўрадлівасці,***
- ***Паходжанне месяца «жнівень», «кастрычнік» звязваюць з паходжаннем народных свят, абрадаў, традыцый,***
- ***Асаблівасці паходжання назваў можна прасачыць у народных прымаўках, прыказках, загадках, прыкметах.***

Літаратурная старонка

Калейдаскоп
снежань 2020

Літаратурная старонка

Вось і снег...

Вось і снег...
Пабялела зямля,
І стаілася ўсё навакола.
ляціць, і ляціць ён здаля,

Быццам пыл з-пад шырокага кола.
Абарвалася тонкая ніць
Паміж рознымі порамі года.
На бярозах ці іней звініць,
Ці надзея твая, ці самота?
Вераб'ёў пазганяла з галля,
І шпакоўні нікім не заняты.
Цішыня.
Пасмялела зямля,
Што не зойдуцца ў сцюжы зярняты.
Вось і снег. Перайначыўся свет.
Завіруха мяце навакола.
Толькі б мне не пакінуць свой след,
Быццам пыл з-пад імклівага кола.

Сцяпан Гаўрусёў

***

Марозік грукнуў кіем у акно,
Крылом махнула белая пароша.
І клён імкліва выбег за гумно,
Каб прывітацца з ёлкай-снеганошай.

Які прастор, якая чысціня!
Гарыць усход кастром чырвона-сінім.
Заспаны месяц шапку-хмарку зняў
І страсянуў у неба белы іней.

Алег Салтук

Цікава ведаць

Калейдаскоп
снежань 2020

СНЕЖАНЬ

Этымалогія назвы	Народныя прыкметы месяца	Беларускія каляндарныя святы
Апошні месяц года атрымаў назву ад слова "снег"	Снежань зіму пачынае, а год канчае. Мароз у снежні і снег вышэй хаты – будзе год тады багаты.	4 – Узвядзенне 9 – Юр'я 13 – Дзень святога Андрэя 19 – Мікола зімовы





Цікава ведаць

Калейдаскоп
снежань 2020

З часоў мінулых… Гісторыя святкавання Новага Года

Новы год – любімае для ўсіх свята. Зусім мала часу засталося да яго надыходу. Горад зіхаціць сваім святочным убраннем. Атмасфера чараўніўніцтва панує ўжо не адзін дзень у кожным куточку. А перадсвяточная мітусня выклікае не ўздох, а асалоду. Святкаванне Новага года доўно ўвайшло ў жыццё. Праўда, цяжка сказаць, калі дакладна людзі пачалі адзначаць свята не толькі ў Беларусі, але ва ўсім свеце.

Мяркуецца, што Новы год зарадзіўся ў Месапатаміі, прыкладна 25 стагоддзяў таму. Магчыма, адбылося гэта ў дахрысціянскую эпоху і на тэрыторыі Беларусі. У тыя часы людзі пакланяліся Сонцу як галоўнаму з багоў, ад літасці якога залежыла жыццё на Зямлі. Лічылася, што Новы год бярэ пачатак з абнаўлення прыроды, а дакладней, з надыходам вясны, таму сустракалі яго 1-га сакавіка. Традыцыі свята былі звязаныя з гуканнем вясны і працягваліся больш за месяц.

Цікава ведаць

Калейдаскоп
снежань 2020

З часоў мінулых… Гісторыя святкавання Новага Года

Доўгі час у розных кутках Беларусі Новы год сустракалі ў розныя даты. У гістарычнай літаратуры святкаванне Новага года падаецца ажно шэсць разоў. Звычайна яны называюцца каляндарнымі стылямі. Напрыклад, Новы год, адзначаны 1 сакавіка, меў назву сакавіцкі стыль, а з 1 верасня – вераснёўскі стыль, які прыйшоў на змену папярэдняму па загаду маскоўскага сінода ў 1492 годзе, бо заўсёды дата 1 верасня лічылася пачаткам заснавання свету (ёсць яна і зараз у праваслаўным каляндары –14 верасня).

Сённяшні Новы год пазначаецца як студзеньскі стыль; існаваў і калядны стыль – Новы год, які пачынаўся з 25 снежня, а такі стыль, як благавешчанскі – браў пачатак з 25 сакавіка; вялікодны стыль адзначаўся ў Вялікодную нядзелю. Акрамя ўсяго, Новы год сустракалі на Купалле, і некаторыя навукоўцы пазначаюць з 23 красавіка – гэта Юр'еў дзень. А калі ўлічваць тое, што святкаваць іх можна і па старым стылі (прыпадае на 14-ты дзень месяца), то гісторыя свята вельмі багатая. На жаль, не захавалася дакладных звестак, калі на Беларусі пачалі святкаваць Новы год зімою, адпаведна Юліянскаму каляндару, які ўводзіўся ў ВКЛ з прыняццем хрысціянства; навукоўцы падаюць звесткі – бліжэй да Сярэднявечча. Праўда, дакладна вядома з гістарычных звестак, што з увядзеннем у 1584 годзе ў ВКЛ грыгарыянскага каляндара Новы год у межах усёй краіны адзначалі 1-га студзеня, значна раней, чым лічылася, што ў 1700 годзе па загаду Пятра I. Паспрыяла такой змене з'яўленне ўніяцкай царквы, якая прыняла новы стыль.

Паступова пачалі ўзнікаць новыя традыцыі ў святкаванні Новага года. Сустрэча яго праходзіла ў час калядных святак. Калядоўшчыкі і звездары з віншаваннем, песнямі хадзілі па хатах, а гаспадары ў сваю чаргу ўзнагароджвалі падарункамі – рознымі прысмакамі. Лічылася вялікай пашанай, калі калядоўшчыкі наведваліся да гаспадароў, і вялікай пакутай яму, калі хату абмінулі, бо заставалася чакаць на ўвесь год пакуты, бяды і неспагады.

Перад святам абавязкова прыбіралі і ўпрыгожвалі хату, каб наступны новы год сутрэць у чысціні і ладзе. Галоўным у новагоднім свяце, як і сёння, была вячэра. На яе гатавалі 12 розных страў, гэта былі самыя лепшыя прысмакі, кожная страва сімвалізавала месяц года; лічылася " Як сустрэнеш Новы год, такім ён і будзе". Самай значнай сярод страў лічылася куцця.

Цікава ведаць

Калейдаскоп
снежань 2020

З часоў мінулых… Гісторыя святкавання Новага Года

Існаваў шэраг навагодніх абрадаў, звычаяў, прымет, у якія выключна верылі людзі. Новы год – гэта часовая мяжа, пераступаючы якую, хацелася б ведаць, што чакае ў будучым. Варажба таму мела вялікую папулярнасць у людзей, асабліва сярод моладзі. Верылі нашы продкі і ў тое, што калі з чалавекам здараецца нешта дрэннае ў гэты дзень, то чакаць яму ўвесь наступны год пакуты. Імкнуліся да свята разлічыцца з даўгамі, каб наступны год не цягнуў пазыку старога. Стараліся быць бадзёрымі, не быць соннымі, каб зноў - такі не ленавацца і не праспаць ўвесь год. Забаранялася і цяжкая праца 1 студзеня, каб у новым годзе з жаданнем працаваць і мець задавальненне ад яе, а не цяжар. Пад час першага ўмывання ў новым годзе, у ваду клалі залатыя, срэбныя манеты, каб на працягу года быць моцным, прыгожым, светлым і чыстым…

Паступова, дзесь прыкладна з другой палове XIX ст. распаўсюдзіўся звычай ставіць елку; які прыйшоў да нас з Еўропы. Праўда, спачатку елку ўпрыгожвалі толькі багатыя людзі, а сяляне – пазней. Упрыгожвалі яе яблыкамі, арэхамі і аплаткамі, а з цягам часу пачалі з’яўляцца звыклыя для нас шышкі, шары, сняжынкі, хаткі … Елка стала сімвалам свята. Зеляніна яе сімвалізуе сабою вечнае жыццё, яго бясконнасць і неўміручасць…

У гісторыю свята ў канца XIXст - пачатку XX ст. уваходзіць Дзед Мароз. З кожным разам Дзед Мароз змяняўся, стаў любімым казачным героем, які дорыць падарункі не толькі дзецям, але і дарослым – усім, хто ў яго верыць. З’явілася ў яго ўнучка – Снягурка, ды памагатыя Зіма, Завея, лясныя жыхары. Зараз Дзед Мароз жыве ў Белавежскай пушчы, сюды да яго прыязджае ў госці на тры зімнія месяцы ўнучка Снягурка і госці з розных краін свету.

З кожным стагоддзем у святкаванні і сутрэчы Новага года адбываліся змены. Змяніліся многія традыцыі, прыкметы, абрады, але шмат чаго захавалася да нашага часу. А самае галоўнае, што Новы год назаўсёды застаецца самым казачным і жаданым святам.

Рэдкалегія: Аліева Анастасія (8в),
Кузьміна Кацярына (8в), Прасаловіч Юлія (8в),
Сарокіна Вікторыя (8в), Федарэнка Вікторыя(8в).
Рэдактар Юрчанка С. А.